ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2019 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
рэгіянальнага фестывалю-конкурсу бардаўскай песні
памяці У. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-конкурсу бардаўскай песні памяці У. Высоцкага "Музыка сэрцаў" (далей – Фестываль-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю-конкурсу з'яўляюцца: пошук і выяўленне новых творчых талентаў у жанры бардаўскай песні; аб'яднанне аднадумцаў у сферы захавання і падтрымцы культурнага пласта выканаўцаў бардаўскай музыкі; стымуляванне развіцця творчых здольнасцяў удзельнікаў; фарміраванне культуры сучаснага, адпачынку; стымуляванне грамадскай цікавасці да традыцый бардаўскай музыкі.

3. Арганізатарамі Фестывалю-конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Навагрудскі раённы выканаўчы камітэт, аддзел культуры Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта, ДУК "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (Дадатак 1).

4. Фестываль-конкурс праводзіцца 20-21 ліпеня 2019 года на тэрыторыі возера Літоўка Навагрудскага раёна. (У выпадку дрэннага надвор'я, асноўная частка мерапрыемства (конкурс) будзе праходзіць у глядзельнай зале ДУК "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (г. Навагрудак, пл. Леніна, 7).

5. У Фестывалі-конкурсе прымаюць удзел выканаўцы твораў, аўтары музыкі ці слоў выконваемага твора, выканаўцы твораў У. Высоцкага, творчыя калектывы, асноўным напрамкам дзейнасці якіх з'яўляецца захаванне і падтрымка традыцый бардаўскай музыкі і творчасці У. Высоцкага. Узрост удзельнікаў - ад 16 гадоў.

6. У праграму выступлення кожнага ўдзельніка ўключаюцца 2 творы, адзін з якіх – твор У. Высоцкага, якія павінны быць выкананы пад "жывы" акампанемент, пры неабходнасці - з выкарыстаннем дапаможнай фанаграмы "-1".

7. Удзельнікі Фестывалю-конкурсу маюць права прыняць удзел у двух днях фестывалю альбо толькі ў першым конкурсным дні, што дадаткова адзначаецца у заяўцы. Удзельнікам таксама неабходна падрыхтаваць 2-3 нумары для ўдзелу ў канцэрце ў фармаце БАРД-БАТЛ "Сам – насам з усімі".

8. Па выніках Фестывалю-конкурсу журы (Дадатак 2) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступені) ў наступных намінацыях:
- "выканаўца аўтарскага твора" (аўтар слоў і музыкі);
- "аўтар слоў выконваемага твора";
- "аўтар музыкі выконваемага твора";
- "выканаўца твора У. Высоцкага";
- "аўтарскі калектыў";
- "глядацкія сімпатыі".

9. Астатнія ўдзельнікі Фестывалю-конкурсу атрымліваюць дыплом за ўдзел у фестывалі.

10. Журы мае права не прысвойваць месцы, падзяляць II, III месцы, аб'ядноўваць або змяняць ці ўводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду, вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатаў.

11. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

12. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:
- ідэйна-мастацкі ўзровень конкурснага твора;
- выканальніцкае майстэрства;
- сцэнічная культура;
- арыгінальнасць і навізна ў падачы матэрыялу;
- артыстызм.

13. Неабходна абавязкова адзначыць у заяўцы месца пражывання ў ноч з 20 на 21 ліпеня 2019 г., і колькасць чалавек (групы падтрымкі). Пры пражыванні ў гасцініцы неабходна мець пры сабе пашпарт (аплата за наяўны разлік, альбо за кошт камандзіруючай арганізацыі). Можна ўсталяваць асабістую палатку на тэрыторыі возера Літоўка.

14. Для ўдзелу ў Фестывалі-конкурсе да 17 ліпеня 2019 года накіроўваюцца заяўкі (Дадатак 3) на электронны адрас: ДУК "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (novogrudokrmc@tut.by). Даведкі па тэл/ф.: 8(01597)60200, 60250.

15. Фінансаванне Фестывалю-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту, прадугледжаных у каштарысе аддзела культуры Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

16. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

17. Для фінансавання Фестывалю-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18. Арганізатары Фестывалю-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў выканаўцаў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі.

За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

19. Удзел у Фестывалі-конкурсе азначае поўнае і безумоўнае прыняцце правілаў дадзенай Інструкцыі.

20. Транспартныя выдаткі ўдзельнікаў Фестывалю-конкурсу ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-конкурсу бардаўскай песні памяці У. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Грыц А.М. | намеснік старшыні Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта (далей - райвыканкам), *старшыня аргкамітэта.* |
| Шабановіч М.К. | начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама *сустаршыня аргкамітэта.* |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. |
| Альцман А.М. | начальнік Навагрудскага раёна электрычных сетак. |
| Бараноўскі М.В. | дырэктар Навагрудскага раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. |
| Вагабаў Р.А. | начальнік аддзела ўнутраных спраў Навагрудскага райвыканкама. |
| Лазовік Ж.В. | начальнік фінансавага аддзела Навагрудскага райвыканкама. |
| Ліннік А.М. | начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама. |
| Грамыка П.А. | галоўны ўрач дзяржаўнай установы "Навагрудскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі". |
| Ермакова А.Я. | галоўны рэдактар газеты "Новае жыццё". |

| | |
|---|---|
| Рэдзька У.А. | загадчык сектара гандлю і паслуг аддзела эканомікі Навагрудскага райвыканкама. |
| Свірыд У.С. | начальнік Навагрудскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. |
| Сіліч А.І. | галоўны ўрач ўстановы аховы здароўя "Навагрудская цэнтральная раённая бальніца". |
| Ходар І.А. | галоўны рэдактар установы "Рэдакцыя праграмы " Навагрудскія навіны. |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-конкурсу бардаўскай песні памяці У. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

## СКЛАД ЖУРЫ

| | |
|---|---|
| Каралько С. М. | намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама, *старшыня журы.* |
| Чаркасаў-Мічурынскі А. | беларускі спявак, кампазітар, *сустаршыня журы.* |
| Шабановіч М. К. | начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама. |
| Жышко Н.М. | галоўны спецыяліст аддзела култьтуры Навагрудскага райвыканкама. |
| Кавальская Н.П. | дырэктар ДУК "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці". |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
_____________гар(рай)выканкама

**Заяўка на ўдзел у рэгіянальным фестывалі-конкурсе бардаўскай песні памяці У. Высоцкага “Музыка сэрцаў”**

1. Раён ______________________________
2. Намінацыя ______________________________
3. Імя, прозвішча, імя па бацьку ўдзельніка ______________________________
4. Дата, год нараджэння ______________________________
5. База дзейнасці ______________________________
6. Месца працы, вучобы ўдзельніка ______________________________
7. Пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выдадзены) ______________________________
______________________________
8. Назвы нумароў (аўтары музыкі і слоў) ______________________________
______________________________
9. Кантактны тэлефон і E-mail. ______________________________
10. Неабходнае абсталяванне і тэхнічнае забеспячэнне ______________________________
______________________________
11. Кароткая творчая характарыстыка ______________________________
12. Дні ўдзелу ______________________________
13. Колькасць чалавек ______________________________
14. Месца пражывання ______________________________
15. Умовы пражывання (асабістая палатка, палатка арганізатараў) ______________

Кіраўнік базавай установы ______________
(подпіс)

______________________________
(ініцыялы, прозвішча)

Заяўкі на ўдзел у рэгіянальным фестывалі-конкурсе бардаўскай песні памяці У. Высоцкага павінны выслаць не пазней 17 ліпеня 2019 г. на адрас: 231400 г. Навагрудак, пл. Леніна, 7, эл.пошта: novogrudokrmc@tut.by, тэл. факс 8(01597)60200, 60250 Кантактная інфармацыя: дырэктар 8(01597)60250, аддзел метадычнай работы 8(01597)60200.